Першынство па міні-футболе сярод ксяндзоў — гэта спатканне еўрапейскіх святароў з розных краін. Мы хочам сустрэцца, пагаварыць, падзяліцца вопытам. Тым больш адзін аднаго добра ведаем. Акрамя таго, сёння праз спорт мы можам выйсці на людзей, якія, магчыма, не заўсёды ходзяць у касцёл. Для нас гэта асноўная задача. Аднак чэмпіянат — гэта спаборніцтвы, і кожны хоча сябе паказаць з найлепшага боку і быць на першым месцы. Святары з Беларусі ў гэтым не выключэнне.

— Чуў, што асноўная праблема для многіх удзельнікаў звязана з атрыманнем візы.

— Яна не існуе. Удзельнікі, якія будуць дабірацца ў Ліду аўтобусамі, візы ўжо атрымалі ў сваіх краінах. А тыя каманды, што будуць ляцець самалётамі, атрымаюць іх у аэрапорце.

— Ці будзе добрая падтрымка ад гледачоў?

— Так, лічу, будзе шмат балельшчыкаў. Чуў, што падтрымаць нашу каманду прыедуць з Мінска, Гродна. Спадзяюся, на трыбунах будуць балельшчыкі і з іншых куткоў Беларусі. Ніякіх квіткоў набываць не прыйдзецца. Паглядзець матчы здолее кожны ахвотны. Запрашаем усіх прыходзіць на матчы і падтрымліваць нашу каманду.

Тарас ШЧЫРЫ

А тым часам...

Нормы бяспошліннага ўвозу тавараў з замежных інтэрнэт-магазінаў могуць змяніць

Пра гэта заявіў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі, перадаюць інфармаагенцтвы.

Па яго словах, аб'ёмы заказаў беларусамі тавараў такім спосабам павялічваюцца. Таму магчымы змены нормаў увозу тавараў фізічнымі асобамі: «Будзе ўнесена прапанова і прынята рашэнне ўрадам Беларусі», — сказаў Аляксандр Шпілеўскі. Яго турбуе сітуацыя з перапродажам падобных заказаных тавараў на тэрыторыі нашай краіны: «Гэта ператвараецца ў прыгранічны бізнес, у які ўцягнуты дзясяткі тысяч чалавек. Яны, маючы добрую адукацыю, ні дня не прапрацавалі, жывуць толькі гэтым», — сказаў ён.

Варта адзначыць, што сёння пры заказе ў замежным інтэрнэт-магазіне жыхар краіны можа бяспошлінна атрымаць тавар на агульную суму 120 еўра на працягу каляндарнага месяца, калі дастаўка заказу ажыццяўляецца міжнародным паштовым адпраўленнем. У Расіі і Казахстане бяспошлінная сума складае адпаведна 1000 і 1500 еўра.

Цікава, што і расійская мытня заяўляе аб тым, што збіраецца ініцыяваць зніжэнне нормы бяспошліннага ўвозу. Пакуль выказваюцца меркаванні аб 150 еўра. У другога нашага мытнага брата — Казахстана — пакуль што пра зніжэнне не казалі.

Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 1-е паўг. 2014 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Прычоска для... поні

22 лютага ў аграгурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы» адбудзецца конкурс прыгажосці сярод поні.

Сярод шматлікіх прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія пражываюць у маёнтку, пяцёра поні, у тым ліку цэлая сям'я: тата па мянушцы Кранцье, мама Філіс і Фліка. Хто з іх ці іншых удзельнікаў самы прыгожы? Гэта, як і мае быць на конкурсе, вызначаць члены журы. Усё будзе па-сапраўднаму. Канкурсанты прадставяць сваю «візітоўку» (дзе нарадзіўся, хто бацькі), выступяць з дэфіле (у «купальніках» і святочных касцюмах), а таксама праявяць свае здольнасці ў праходжанні паласы выпрабаванняў. Акрамя таго, адбудуцца конкурсы гурманаў і прычосак.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Плати одним движением руки!»

1. Организатор рекламной игры.
Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

2. Наименование рекламной игры.
Рекламная игра, проводимая Организатором, носит название **«Плати одним движением руки!».**

3. Территория проведения.
Рекламная игра **«Плати одним движением руки!»** проводится на территории Республики Беларусь в Центральном универмаге «Минск» (ЦУМ), по адресу: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 54.

4. Срок начала и окончания рекламной игры.
Игра проводится с 24 февраля 2014 года по 19 апреля 2014 года (включая период розыгрыша и вручения призов).

5. Состав комиссии по проведению рекламной игры.
Председатель комиссии – Юрий Леонидович Реут, директор ООО «360 медиа групп»;
Заместитель Председателя комиссии – Багдюк Алеся Вячеславовна, специалист ООО «360 медиа групп»;
Члены комиссии:
1. Александр Станиславович Реут – специалист ООО «360 медиа групп»;
2. Ивановская Наталья Романовна – специалист по работе с клиентами ООО «Смарт Нова»;
3. Полещук Евгения Константиновна – специалист ЧУП «Адамекс».

6. Цель Игры.
Игра проводится в целях стимулирования расчетов платежными картами Visa по бесконтактной технологии PayWave в Центральном универмаге «Минск» (ЦУМ), по адресу: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 54.

7. Условия участия и порядок отбора участников рекламной игры.
Участниками рекламной игры «Плати одним движением руки!» являются:
- физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающее на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, являющиеся держателями банковских платежных карточек Visa, которые в период с 24.02.2014 года по 16.03.2014 года совершили с использованием банковской платежной карточки по бесконтактной технологии PayWave безналичную операцию по оплате товаров (услуг) на любую сумму в Центральном универмаге «Минск» (ЦУМ), по адресу: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 54.
Участниками Игры не могут быть члены Комиссии, а так же лица, состоящие в трудовых отношениях с организатором, их супруги, близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства.
Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное представление информации о транзакциях другими участниками системы безналичных расчетов.
В случае если одно физическое лицо совершило несколько безналичных операций, соответствующим настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз. Из безналичных операций, соответствующих Правилам, формируется список участников игры (далее – Список участников).
Таким же образом выбирается резервный список из 3 (трех) номеров участников Игры, который может использоваться в соответствии с настоящими правилами для определения получателей Главных призов.

8. Состав и размер призового фонда.
Призовой фонд Игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора. Общий размер Призового фонда составляет 34 090 909 (Тридцать четыре миллиона девяносто тысяч девятьсот девять) белорусских рублей.

№	Наименование	Количество, шт.	Цена единицы с НДС, бел. руб.	Общая стоимость с НДС, бел. руб.
1	Подарочный сертификат на услуги компании ООО «ТОП-ТУР» на сумму 30 000 000 бел. руб. и денежный приз в размере 4 090 909 бел. руб. Срок действия сертификата: с 31 января 2014 г. по 31 января 2015 г.	1	30 000 000	30 000 000
			4 090 909	4 090 909
	Итого		**34 090 909**	**34 090 909**

9. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравшего участника рекламной игры.
К моменту розыгрыша данные об участниках Игры формируются в Список Участников. Каждому участнику Игры в Списке Участников последовательно присваивается индивидуальный порядковый номер по номеру транзакции. Все порядковые номера имеют одинаковую разрядность.
Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся барабан и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.
Из состава Комиссии выбирается секретарь для извлечения шаров из барабана.
Определение выигрышного номера получателя Приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.
Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника игры в списке. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.
После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Списке Участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Списке Участников.
Таким же образом выбирается резервный список из 2 (двух) номеров участников Игры, который может использоваться в соответствии с настоящими правилами для определения получателя приза.

Дата проведения розыгрыша:

Дата и время проведения розыгрыша	Условия участия	Разыгрываемый приз
19 марта 2014 г. в 11.00	Розыгрыш проводится среди Участников, которые совершили безналичную операцию по оплате товаров (услуг) на любую сумму с использованием банковской платежной карточки Visa по бесконтактной технологии PayWave в Центральном универмаге «Минск» (ЦУМ) в период с 24.02.2014 г. по 16.03.2014 г. включительно.	Подарочный сертификат на услуги компании ООО «ТОП-ТУР» на сумму 30 000 000 бел. руб. и денежный приз в размере 4 090 909 бел. руб.

Розыгрыш Призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 1, офис ООО «Смарт Нова».

10. Срок и способ информирования выигравшего участника, порядок вручения приза.
После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше приза по почте и телефону до 25 марта 2014 г. включительно. После получения уведомления о выигрыше Получатель приза не позднее 2-х рабочих дней со дня уведомления должен связаться с Организатором по тел. 8-017-389-00-15 в период с 9:00 до 21:00 в рабочие дни либо по телефонам, которые будут указаны при уведомлении, и предоставить в эти же сроки Организатору письменное подтверждение согласия на получение приза (далее – Письменное подтверждение). В Письменном подтверждении должна содержаться следующая информация:
- согласие на получение Приза в полном объеме;
- сведения о Получателе приза: фамилия, имя, отчество, дата рождения, серия, номер, срок действия, дата и место выдачи документа, удостоверяющего личность;
- подпись Получателя приза.
Почтовый адрес Организатора: 220073, г. Минск, а/я 56; факс 8 017 290 24 76.
Организатор не несет ответственности за задержку доставки уведомления почтой.
В случае если связаться с Получателем приза не представляется возможным (ввиду его отъезда, смены места жительства и/или телефона, болезни, неистребования уведомления из почтового отделения в течение 2-х рабочих дней с момента его поступления и др.), право на приз переходит к первому участнику рекламной игры из резервного списка.
В случае если Получатель приза не представил Организатору Письменное подтверждение в оговоренные сроки либо представил письменный отказ от получения приза, право на приз переходит к первому участнику Игры из резервного списка. В этом случае сроки и порядок всех уведомлений и подтверждений аналогичны срокам и порядку уведомлений и подтверждений при первоначальном определении Получателя приза.
Денежная компенсация стоимости приза не производится.
Получатель приза не вправе передать право на получение и использование приза другому лицу.

Приз будет вручен победителю лично до 15 апреля 2014 года в Центральном универмаге «Минск» (ЦУМ), по адресу: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 54. Для получения приза необходимо предъявить Организатору паспорт либо вид на жительство. Фактом получения победителем приза является акт передачи приза, подписанный победителем.
В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь Организатор при выдаче приза удерживает у Победителя и перечисляет в бюджет подоходный налог с суммы приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Вручение приза осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога.

11. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.
Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда», а также размещаются на сайте Организатора www.360.by.
Сведения о результатах розыгрыша публикуются до 19 апреля 2014 года в газете «Звязда», а также размещается на сайте Организатора www.360.by. Телефон для справок: 8 017 389 00 15.

12. Общие условия рекламной игры.
Принимая участие в рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в рекламной игре.
Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением рекламной игры, а также результаты проведения рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.
Результаты Игры будут являться окончательными и не могут быть оспорены.
Участник Рекламной игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором рекламной игры для получения приза.
Участвуя в рекламной игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в рекламной игре.
Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи приза должны быть адресованы непосредственно Организатору рекламной игры по адресу: 220073, г. Минск, а/я 56.
Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.
Информацию об условиях участия и проведения рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии»: 8 017 389 00 15 с 9:00 до 21.00 в рабочие дни.

Свидетельство о регистрации №2304 от 13.02.2014 выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

■ Здароўе нацыі

ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЯ — СПРАВА НЕ ТОЛЬКІ МЕДЫКАЎ

Каля 22 працэнтаў сем'яў беларусаў, паводле апытанняў, займаюцца фізкультурай і спортам. Каля 30 працэнтаў — залежаць ад тытуню. Можна сказаць, што адна з гэтых лічбаў надта нізкая, а другая — высокая. Аднак літаральна дзесяць гадоў таму ў нашай краіне курцоў было на 10 працэнтаў больш, а спортам займаліся… правільна, толькі спартсмены. Сур'ёзная прафілактычная работа робіць сваю справу. Надалей жа медыцынская служба будзе ўцягваць у працэс прафілактыкі кожнага паасобку, у тым ліку кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія ў сучасных умовах абавязаны клапаціцца яшчэ і пра здароўе сваіх падначаленых. Пра іншы важны складнік у галіне аховы здароўя — якасць аказання медыцынскай дапамогі — расказваюць спецыялісты.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАГРУЗКА НА СТАЦЫЯНАРЫ БУДЗЕ ЗМЯНШАЦЦА

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Таццяна МІГАЛЬ:

— Летась у краіне зноў зафіксаваны нізкі каэфіцыент дзіцячай смяротнасці. Назіралася зніжэнне агульнай смяротнасці, колькасці выпадкаў смерці ад анкалагічных захворванняў, хвароб органаў стрававання і дыхання, знешніх прычын. Паколькі летась крыху вырасла нараджальнасць, у першую чаргу мы будзем удасканальваць аказанне дапамогі маці і дзецям. Цяпер, напрыклад, працягваецца рэканструкцыя жаночых кансультацый, удасканальваюцца методыкі аказання дапамогі немаўлятам. У развіцці спецыялізаванай дапамогі ўпор робіцца на анкалагічныя і сардэчна-сасудзістыя захворванні, хваробы органаў дыхання і цукровы дыябет.

Набліжэнне меддапамогі да сельскіх жыхароў застаецца актуальным пытаннем. На вёсцы ўдасканаленне меддапамогі ажыццяўляецца з дапамогай урачоў агульнай практыкі (павялічваецца іх колькасць, удасканальваецца падрыхтоўка), у гарадзе ўкараняецца вопыт работы з удзелам каманды спецыялістаў — участковы ўрач, памочнік урача і медсястра.

Дыспансерызацыя насельніцтва — задача не толькі медработнікаў, але і кожнага чалавека. На гэта скіраваны праект закона «Аб ахове здароўя», дзе вялікая ўвага надаецца выхаванню адказнасці за сваё здароўе і, па-другое, ажыццяўленню захадаў па ахове здароўя насельніцтва юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Распрацоўваецца і нарматыўна-прававая база, якая будзе рэгламентаваць абгрунтаванасць выклікаў «хуткай дапамогі» і ўрача на дом.

У хуткім часе плануецца перагледзець клінічныя пратаколы дыягностыкі і лячэння захворванняў — выдаліць даследаванні, якія дублююць адно аднаго, улічыць новыя метады дыягностыкі і лячэння, працягнуць укараненне стацыянарзамяшчальных тэхналогій.

У Мінску, Салігорску працягваюцца пілотныя праекты па скрынінгу раку прастаты, малочнай залозы, шыйкі маткі і тоўстага кішэчніка. Скрынінгавыя праграмы (у межах якіх абследуецца здаровае насельніцтва) вельмі дарагія, а таму неабходна выпрацаваць дакладны механізм іх правядзення дзеля далейшага ўкаранення ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Для больш шырокага ўкаранення стацыянарзамяшчальных тэхналогій, удасканалення ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў у рэгіёнах будзем праводзіць ратацыю кадраў.

НОВЫЯ АПТЭКІ БУДУЦЬ З'ЯЎЛЯЦЦА ТОЛЬКІ Ў НОВЫХ РАЁНАХ

Генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Белфармацыя» Ігар КАВАЛЬЧУК:

— На пачатак года ў краіне функцыянуе 2950 аптэк, з якіх 1665 — дзяржаўнай формы ўласнасці. Згодна з сацыяльным стандартам, адна аптэка павінна прыпадаць на 11,5 тысячы насельніцтва ў сталіцы і на 8 тысяч — у абласцях. У нас цяпер у цэлым па краіне адна аптэка прыпадае на 3,2 тысячы чалавек. Далейшае пашырэнне сеткі аптэк мэтазгоднае толькі ў новабудоўлях.

Жорсткія патрабаванні прад'яўляюцца да наменклатурнага асартыменту аптэк, паколькі гэта дазваляе забяспечыць пацыентаў неабходнымі лекамі па першым патрабаванні або на працягу пяці дзён. Ажыццяўляецца пастаянны кантроль за бесперабойнай наяўнасцю лекавых сродкаў, уключаных у пералік асноўных лекавых сродкаў. Наогул на фармацэўтычным рынку краіны — звыш 5 тысяч найменняў лекавых сродкаў, 1200 з іх пастаўляюцца беларускімі вытворцамі. Летась у межах праграмы імпартазамяшчэння былі асвоены 103 новыя лекавыя прэпараты. Беларускія лекі — гэта і даступнасць па кошце, і мінімальныя тэрміны выканання паставак у аптэкі. Штогадовы рост аб'ёмаў рэалізацыі беларускай прадукцыі складаў 20–25 працэнтаў. Для падтрымання даступнага ўзроўню цэн на лекі, прадухілення неабгрунтаванага іх росту ўстаноўлены кантроль за парадкам іх фарміравання — шляхам пастаяннага маніторынгу. Закупкі імпартных лекаў па вынніках конкурсных таргоў дазваляюць захаваць кантрактныя цэны нязменнымі на працягу года. Нязначныя ваганні рознічных цэн абумоўлены зменай курсу валют Нацыянальнага банка.

Для зніжэння коштавай нагрузкі аптэкі прадпрыемстваў «Фармацыя» рэалізуюць усе айчынныя лекі маламаёмасным грамадзянам — пенсіянерам, інвалідам усіх катэгорый, шматдзетным сем'ям і дзецям да 3 гадоў — са зніжкай 5 працэнтаў ад рознічнага кошту.

Для аператыўнага вырашэння пытанняў, што ўзнікаюць у службах нашага прадпрыемства, дзейнічае «гарачая» тэлефонная лінія. На сайце www.farma.by працуе інтэрнэт-прыёмная, якая дазваляе ў электронным выглядзе звярнуцца з пытаннем лекавага забеспячэння і інтэрактыўна атрымаць неабходную інфармацыю.

Начальнік аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Наталля МАЛАШКА:

У НАС ЁСЦЬ УСЕ НЕАБХОДНЫЯ ЛЕКІ ДЛЯ ЛЯЧЭННЯ РАКУ

— На набыццё лекаў толькі за кошт сродкаў міністэрства аховы здароўя плануецца патраціць сёлета звыш 80 млн долараў. Большая частка пойдзе на набыццё супрацьпухлінных прэпаратаў. Неабходна адзначыць, што задача любой сістэмы аховы здароўя — патраціць грошы рацыянальна, так, каб набыць больш лекаў, якія дапамогуць большай колькасці людзей. Можна набыць вельмі дарагія лекі і ахапіць абмежаваную колькасць людзей, а можна набыць лекі па аптымальным кошце і дапамагчы вялікай колькасці пацыентаў.

Адразу заўважу, што сёння ў Беларусі ёсць усе неабходныя прэпараты для лячэння тых жа анкахворых. Можна пачуць, як нехта прадае кватэры, машыны, каб набыць нейкія вельмі дарагія цуда-прэпараты за мяжой. Гэта памылковае ўяўленне, што ў нашай краіне — недастатковыя магчымасці, а недзе ў развітых краінах ёсць штосьці такое, што лечыць рак.

Для падтрымання даступнага ўзроўню цэн на лекі, прадухілення неабгрунтаванага іх росту ўстаноўлены кантроль за парадкам іх фарміравання — шляхам пастаяннага маніторынгу.

Зараз у краіне дзейнічае пералік асноўных лекавых сродкаў, куды ўключаюцца лекі для аказання бясплатнай і льготнай дапамогі на амбулаторным этапе. У новы Рэспубліканскі фармуляр уключаюцца як асноўныя лекавыя сродкі, так і лекі, якія ўваходзяць у пратаколы лячэння ў стацыянарах.

РЭАБІЛІТАЦЫЯ — КРОК ЗА КРОКАМ

Дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Васіль СМЫЧОК:

— Наша краіна — адзіная на постсавецкай прасторы — мае этапную сістэму правядзення рэабілітацыі. Лячэбна-рэабілітацыйны этап у стацыянары, стацыянарны этап ранняй медыцынскай рэабілітацыі, амбулаторна-поліклінічны этап, хатні этап, наступная рэабілітацыя і этап санаторны. Так, у выніку інсульту пацыент трапляе спачатку ў рэанімацыйнае, затым неўралагічнае аддзяленне, а далей яго непасрэдна з бальніцы на машыне хуткай дапамогі перавозяць у стацыянарнае аддзяленне ранняй медрэабілітацыі. Безумоўна, для кожнага этапу ёсць свае паказанні.

У кожнай вобласці працуе шматпрофільны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі. Усяго па краіне — 315 аддзяленняў і цэнтраў медрэабілітацыі. 229 з іх — амбулаторна-поліклінічныя, астатнія — стацыянарныя. Гэта дастатковая колькасць для правядзення рэабілітацыйных мерапрыемстваў пацыентам з цяжкай кардыялагічнай, неўралагічнай, траўматалагічнай, эндакрыналагічнай паталогіямі.

У Беларусі 528 тысяч інвалідаў. Летась упершыню за апошнія некалькі гадоў гэта колькасць перастала расці. Наогул, гэтую лічбу трэба правільна разумець. У нас знікаецца першасны выхад на інваліднасць, аднак агульная колькасць інвалідаў расце за кошт павелічэння працягласці жыцця гэтай катэгорыі пацыентаў. Дзяцей-інвалідаў у краіне — каля 26 тысяч, а яшчэ што зусім нядаўна мы гаварылі пра 29–30 тысяч.

Раней інваліднасць устанаўлівалася за страту працаздольнасці, а сёння чалавек можа быць працаздольным, але інвалідам. Гэта міжнародны падыход: інваліднасць прызначаецца за абмежаванне жыццядзейнасці, а не за сам факт наяўнасці захворвання або траўмы, ва ўлік бяруцца толькі наступствы захворванняў.

У міністэрстве разглядаецца пытанне аб адмене працоўных рэкамендацый для інвалідаў. Інваліду ўжо не будуць рэкамендаваць, дзе і кім працаваць. Няхай чалавек працуе, кім хоча, калі не нашкодзіць ні свайму, ні чужому здароўю.

СТАЛІЦА: ПАЦЫЕНТАМ — БОЛЬШ ІНФАРМАЦЫІ

Першы намеснік старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ігар ЮРКЕВІЧ:

— Летась на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя сталіцы было затрачана каля трыльёна рублёў. 200 млрд з іх — гэта набыццё абсталявання, 800 млрд — капітальны рамонт і будаўніцтва новых аб'ектаў. У выніку мы атрымалі 14 буйных аб'ектаў — сярод іх новая падстанцыя хуткай дапамогі, дзіцячая і дарослая паліклінікі і інш. Здача новага радзільнага дома на тэрыторыі 5-й клінічнай бальніцы запланавана на першае паўгоддзе 2015 года. Гэта важны для горада аб'ект. Дарэчы, у 2013 годзе ў сталіцы нарадзілася на 361 дзіця больш, чым у папярэднім годзе.

Працягваецца рэканструкцыя паліклінічных устаноў, укараняецца магчымасць электроннага вядзення гісторый хвароб, медкартак амбулаторнага хворага, пасля чаго пачнецца стварэнне адзінага цэнтра даных пацыентаў, што для апошніх абяцае быць вельмі зручным. Вядзецца збор інфармацыі па ўсіх відах платных медыцынскіх паслуг, каб пацыент мог лёгка і проста атрымаць патрэбную падказку.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Камандзіроўка па пісьму

ЧУЖЫЯ ПАД АДНЫМ ДАХАМ

Больш за дваццаць гадоў жыхарка Капыля не можа размяняць кватэру. Хто вінаваты?

Нездарма ў народзе кажуць: ад кахання да нянавісці — адзін крок. Асабліва калі гэта датычыцца былых сужэнцаў. Моцныя пачуцці калісьці прывялі іх да стварэння сям'і, але наступіў момант, і яны сталі чужымі. Нават нягледзячы на тое, што іх павінна звязваць, агульных дзяцей. Якімі стануць адносіны калісьці блізкіх людзей пасля разводу? Як адзначаюць спецыялісты, пераважная большасць «былых» становіцца ворагамі, і кожны лічыць сябе ў нечым абдзеленым.

І ў цеснаце, і ў крыўдзе

У 1990 годзе Ганна і Іван Ждановічы афіцыйна развяліся. Па рашэнні Капыльскага суда паміж імі была падзелена кватэра. Жанчыне дастаўся пакой у 11,5 кв. м, мужчыну — у 16,5 квадрата, якія ён затым прыватызаваў. Як сцвярджае былая жонка, Іван Ждановіч доўгі час не пускаў яе ў кватэру. Давялося двойчы звярнуцца ў суд аб прымусовым усяленні. Іскі былі задаволены. «Пасля гэтага Іван Ждановіч, які на той час пабраўся шлюбам з іншай жанчынай, пачаў мяне тэрарызаваць як маральна, так і фізічна. Мне давялося каля двух гадоў начаваць на сваім рабочым месцы. Таму вымушана была прасіць Капыльскі раённы выканаўчы камітэт знайсці магчымасць размяняць кватэру. Але райвыканкам не вырашыў пытання да гэтага часу», — паскардзілася ў рэдакцыю Ганна Ждановіч.

Як той казаў, два салаўі на адной галінцы не пяюць, а два мядзведзі ў адной бярлозе не жывуць. Людзям, якія раней мелі агульныя інтарэсы, пад адных дахам таксама ўжыцца вельмі складана: верх бяруць узаемныя крыўды, эмоцыі, якія перарастаюць у спрэчкі і нават рукапрыкладства. Менавіта на гэтыя абставіны звяртаў увагу ў лісце ў Капыльскі гарвыканкам (цяпер райвыканкам) яшчэ ў студзені 1995 года былы начальнік Капыльскага раённага аддзела ўнутраных спраў В. Піскуноў. Маёр міліцыі прасіў мясцовыя ўлады знайсці магчымасць размяняць жылплошчу. «Інакш наступствы такога «сумеснага» пражывання цяжка ўявіць», — папярэджваў ён. Дадам, што з Івана Ждановіча ўзялі пісьмовае абавязацельства не перашкаджаць былой жонцы наведваць свой пакой, а таксама жыць у ім.

Да згоды не прыйшлі

Улічваючы цяжкасці пражывання пад адным дахам, па сутнасці, чужых людзей, Капыльскі выканкам прапанаваў ім варыянт размену кватэры — на аднапакаёвую добраўпарадкаваную і двухпакаёвую без зручнасцяў. Але такі варыянт Ждановічаў не задаволіў.

— У 2007 годзе ў нас вызваліліся адначасова дзве аднапакаёўкі. Адна з іх — па вуліцы 50 гадоў БССР — не зусім добраўпарадкаваная. Між іншым, там была магчымасць падвядзення ў далейшым газу, вады. Мы пісьмова паведамілі пра гэта Ждановічам. Але атрымалі адказ ад Івана Іванавіча, што ён адмаўляецца ад прапановы. У выпадку, калі бакам не ўдалося дамовіцца паміж сабой, размен можа ажыццяўляцца ў судовым парадку. Мы трымалі гэтыя кватэры колькі маглі, але Ганна Мікалаеўна ў суд не звярнулася. Прынамсі, ніякага судовага рашэння мы не атрымалі, — расказвае начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Марына Канончык. — У 2007-м у Капылі завяршалася ўзвядзенне двух жыллёва-будаўнічых кааператываў. Яны лічыліся даўгабудамі — былі замарожаны з 1999 года, паколькі мы не маглі ўкамплектаваць чаргу, хоць і запрашалі сюды ўсіх ахвотных. У тым жа годзе пачалі фарміравацца новыя кааператывы, і Ганне Мікалаеўне таксама прапанавалі абзавесціся кватэрай з дапамогай ільготнага крэдыту пад 1 працэнт на 40 гадоў. Але згоды ад яе не атрымалі.

Сапраўды, гэтыя словы пацвярджаюцца дакументамі:

«У сувязі з вызваленнем аднапакаёвай кватэры ў жыллёва-будаўнічым кааператыве «Вясна-2011» у Капылі па вуліцы Партызанскай, 36, увод у эксплуатацыю якога запланаваны на снежань 2013 года, прапануем Вам тэрмінова прыбыць у аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама для канкрэтнага вырашэння пытання аб Вашым уступленні ў кааператыў на будаўніцтва 1-пакаёвай кватэры агульнай плошчай 40,99 кв. метраў з дапамогай ільготнага крэдыту. Пра сваю згоду або адмову просім у абавязковым парадку паведаміць у пісьмовай форме ў тэрмін да 27 снежня 2013 года ў аддзел ЖКГ райвыканкама». Гэта была апошняя прапанова, пасля чаго з Ганнай Ждановіч спынілі перапіску, аб чым паведамілі афіцыйна.

— Пачынаючы з 2012 года райвыканкам фарміруе фонд камерцыйнага жылля. У нас было 5 кватэр, якія выдзелілі грамадзянам, што стаялі ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Калі б Ганна Мікалаеўна звярнулася да нас, то мела б першачарговае права засялення ў любую з кватэр, згодна з датай пастаноўкі на ўлік, — тлумачыць Марына Віктараўна.

— Магчыма, яна не чула пра гэта? — пытаюся.

— Інфармацыю мы размясцілі на сайце райвыканкама, у раённай газеце «Слава працы», — тыя, хто хацеў з ёй азнаёміцца, мелі такую магчымасць, — лічыць мая суразмоўца.

— Камерцыйны фонд, як я разумею, будзе і ў далейшым папаўняцца. Ці нельга было б асабіста патэлефанаваць Ганне Мікалаеўне ў тым выпадку, калі ў ім з'явіцца кватэра? — цікаўлюся ў прадстаўніцы ўлады.

— Я б параіла ёй самой больш уважліва сачыць за звесткамі, — казала спецыяліст.

Перспектыва застацца на вуліцы…

Сёння Ганна Мікалаеўна жыве ў інтэрнаце. Блок разлічаны на 4 пакоі. Маленькая кухня нагадвае каморку. Змяшчаюцца тут толькі невялікі стол і газавая пліта, у якой працуе адна канфорка. Гатуюць жыльцы па чарзе. Кідаецца ў вочы падлога ў месцах агульнага карыстання: рамонту тут не было, мабыць, гадоў дваццаць. Але, бадай, не гэта самае страшнае для Ганны Ждановіч. Некаторыя з суседзяў парушаюць правілы грамадскага пражывання: п'юць, шумяць. Здараецца, што ноччу і заснуць немагчыма. Плаціць за такія «зручнасці», са слоў маёй гераіні, даводзіцца ў сярэднім 200 тыс. рублёў штомесяц. Па мерках Капыля гэта нямала. Акрамя таго, мая суразмоўца плаціць, згодна з раздзеленым асабістым рахункам, і за свой пакой у кватэры па вуліцы 50 гадоў БССР. А пенсія ў Ганны Мікалаеўны крыху большая за 2 млн рублёў. Пражыць на яе даволі складана, тым больш што даводзіцца дапамагаць хворай унучцы. (Дачка ў разводзе з мужам, асабістага жылля не мае). Як сцвярджае 62-гадовая жанчына, нават пабудавацца за кошт льготнага крэдыту ў кааператыве яна не магла з-за матэрыяльных цяжкасцяў. У 2016 годзе яе жылплошча ў агульнай з былым мужам кватэры стане арэнднай, бо на прыватызацыю пакоя няма грошай. Яна спрабавала вырашыць пытанне па размене кватэры самастойна, нават давала аб'яву ў раённую газету, але ахвотных не знайшлося. Таму Ганна Мікалаеўна і патрабуе дапамогі райвыканкама. А яшчэ яе палохае перспектыва застацца наогул на вуліцы. Будынак належыць жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Дзе гарантыя, што з жанчынай не скасуюць дагавор пражывання? Няпэўныя перспектывы ці, можна сказаць, іх адсутнасць, штодзённыя хваляванні падарвалі і без таго не вельмі моцнае здароўе Ганны Ждановіч.

Хто ж дапаможа?

Кіраўнік справамі райвыканкама Віктар Плашкевіч не можа сказаць нічога дрэннага пра Ганну Мікалаеўну, нават спачувае ёй па-чалавечы.

— Капыль — горад невялікі, і варыянтаў размену жылплошчы няма. Згодна з жыллёвым кодэксам, райвыканкам не мае права рабіць размен са свайго жыллёвага фонду. Гэта справа толькі двух бакоў — былых мужа і жонкі Ждановічаў, — канстатуе Віктар Максімавіч.

Галоўнае, каб у іх была ўзаемная зацікаўленасць і жаданне прыйсці да паразумення.

Між іншым я пацікавілася ў Івана Ждановіча, ці пабудаваў ён кааператыўную кватэру? Пытанне цалкам заканамернае. Як сведчаць адказы гарадскога Савета яшчэ ад 1995 года, створаная сям'я Ждановічаў (новая. — **Аўт.**) будуе кватэру ў ЖБК «Вясна». Пасля пераезду туды старая двухпакаёўка будзе перададзена Ганне Мікалаеўне.

Але Іван Іванавіч горача запэўніў, што «кааператыў» пабудавала яго цешча для сваёй унучкі…

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Спаборніцтва інтэлектаў

«ЗОРКІ» ПАЧЫНАЮЦЦА З «ЗОРАЧАК»

Павел Філон на абласныя інтэлектуальныя спаборніцтвы для дзяцей малодшай школы ў Гомель прыехаў з Лоева. Для трэцякласніка з маленькага райцэнтра такое выпрабаванне ў навіну: выступленне на вялізнай сцэне ў складзе каманды з трох чалавек, няпростыя заданні, якія трэба выканаць за адведзены час.

Хлопчык, як і яго сябры, вельмі хваляваўся і кажа, што крыху разгубіўся. Але ж ён лічыць, што лоеўская каманда годна сапернічала з камандамі гарадскіх школ. Дарэчы, побач за перамогу змагаліся вундэркінды з двух раёнаў Гомеля, а таксама са Светлагорска і Рэчыцы. Тым не менш менавіта лоеўскія знаўцы закрылі тройку лідараў у сваёй падгрупе. А першымі тут сталі інтэлектуалы гомельскай гімназіі № 51, якія абаранялі гонар усяго Савецкага раёна.

Дарэчы спаборніцтвы праходзілі ў пяці школах Гомельскай вобласці адначасова: у 69-й і 24-ай гомельскіх, у Петрыкаве, Нароўлі і Чачэрску. Упраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама вырашыла правесці дзіцячы конкурс інтэлектуалаў у якасці эксперымента. Назву, дарэчы, зашыфравалі ў абрэвіятуру «ДзетКІ». Пакуль што аналагічных спаборніцтваў для вучняў малодшай школы ў краіне не праводзілася. Хоць многія з педагогаў-наватараў, у тым ліку лаўрэат прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных вучняў, дацэнт Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Святлана Гін, упэўнены, што «зорачак» трэба заўважаць у маленстве і рабіць усё, каб яны ўзыходзілі на небасхіл без усялякіх перашкод. Між іншым, Святлана Іванаўна была адным з аўтараў заданняў для дзяцей на гэты конкурс.

— Дзеці праявілі эрудыцыю, кемлівасць, кругагляд, уменне працаваць у камандзе, — адзначае начальнік аддзела дашкольнага, агульнай, сярэдняй і спецыяльнай адукацыі ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Наталля Сапрыка. — Каля 80 удзельнікаў адначасова працавалі на пяці пляцоўках. Мы пакуль не ставілі ніякіх умоў па крытэрыях адбору навучэнцаў, бо спаборніцтвы праводзіліся першы раз. Прааналізуем вынікі эксперымента, і, магчыма, нешта будзем удасканальваць.

Настаўнікі хваляваліся, здаецца, больш за саміх школьнікаў. Але ж падказваць магчымасцяў не мелі і назіралі за спаборніцтвамі «з трыбун».

— Каб абраць лепшых, напярэдадні ў сваёй гімназіі праводзілі тэставыя заданні, — адзначае Наталля Філон. — І самых-самых накіравалі на гэтую алімпіяду. Калі везлі іх сюды, многія іншыя дзеці задавалі пытанне: а чаму не мы? Магчыма, гэта дасць іншым стымул развівацца ў будучыні.

На інтэлектуальных спаборніцтвах не было слёз і істэрык. Юныя разумнікі вельмі добра адказвалі на ўсе пытанні, а некаторыя з заданняў выконвалі да таго, як скончыўся вызначаны час.

А вось намесніца дырэктара па навучальнай рабоце гімназіі № 51 Гомеля Ларыса Анісавец распавяла, што ў іх навучальнай установе для малодшых школьнікаў другі год праводзіцца конкурс даследчых работ. Таму дзеці падрыхтаваны ў тым ліку да публічных выступленняў. Паводле слоў Ларысы Аляксееўны, у гімназіі ёсць сапраўдныя вундэркінды, але далёка не ўсе могуць працаваць у камандзе. І гэта таксама паўплывала на адбор удзельнікаў на гэты конкурс:

— Мы адбіралі тых, хто ўмее чуць іншага, хто заўсёды хоча ведаць трохі больш, чым па праграме, і пастаянна «мучае» пытаннямі настаўнікаў.

Магу пацвердзіць, што на інтэлектуальных спаборніцтвах не было слёз і істэрык. Юныя разумнікі вельмі добра адказвалі на ўсе пытанні, некаторыя з заданняў выконвалі да таго, як скончыўся вызначаны час.

Трэба адзначыць лідараў у падгрупах. Імі сталі «Фантазёры» Чыгуначнага раёна, жыткавіцкія «Трэцякласнікі XXI стагоддзя», «Чамучкі» з Мазыра і «Усмешка» з Чачэрска. Між тым, па вынніках абласнога конкурсу ніхто не застаўся без сувеніраў і салодкіх падарункаў.

— Хутчэй за ўсё, налета мы будзем рэкамендаваць, каб спачатку аналагічныя конкурсы прайшлі на раённым узроўні, — адзначае Наталля Сапрыка. — Звышзадача для дзяцей — набыць вопыт стасункаў у інтэлектуальных спаборніцтвах. Калі чалавек з маленства вучыцца непасрэдна рэагаваць на сітуацыю, гэта дапаможа ў любой сферы яго жыццядзейнасці. Пры падрыхтоўцы да конкурсу адпрацоўваюцца, вядома, і прадметныя веды. Мы, дарослыя, у гэтых дзецях бачым будучых алімпіяднікаў і ўпэўнены, што такім чынам можна вызначыць і падтрымаць самых таленавітых.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■ Напярэдадні чэмпіянату

ВАЛАНЦЁР, БУДЗЬ ГАТОЎ!

На асноўных аб'ектах чэмпіянату свету па хакеі будзе задзейнічана больш за тысячу валанцёраў, якія валодаюць замежнымі мовамі. Пра гэта на чарговым пасяджэнні падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння і арганізацыі харчавання ў рамках падрыхтоўкі да ЧС-2014 пад старшынствам міністра гандлю паведамілі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і БРСМ.

Яны адзначылі, што праведзена значная работа па падбору валанцёраў і ўдзельнікаў сэрвісных атрадаў у сферы гандлю і грамадскага харчавання. Больш за 80 працэнтаў з іх — гэта студэнты мінскіх ВНУ. Як запэўніў прадстаўнік галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, праблем па працы на аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання падчас правядзення чэмпіянату быць не павінна. Тым больш што для добраахвотных памочнікаў запланаваны шэраг навучальных семінараў. Створаны таксама валанцёрскі рэзерв. Міністр гандлю даручыў да 1 красавіка разабрацца з пытаннямі, што ўзнікаюць пры фарміраванні сэрвісных атрадаў, а таксама па ўзаемадзеянні з галоўным упраўленнем спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Ён падкрэсліў, што па ўзроўні арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання госці і ўдзельнікі чэмпіянату будуць меркаваць пра краіну ў цэлым. «Таму мы не маем права падвесці».

На наступным пасяджэнні падкамітэта плануецца абмеркаваць пытанне арганізацыі бытавога абслугоўвання падчас правядзення чэмпіянату.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Ну і ну!

ПАЛЯВАЛІ НА... МАЛАТКІ З ТРАЛЕЙБУСАЎ

Падчас патрулявання тэрыторыі дэпо электрацягнікоў Мінскага метрапалітэна «Маскоўскае» нарад атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама звярнуў увагу на двух падлеткаў.

Як высветлілася, 16-гадовы і 17-гадовы прыяцелі напярэдадні добра «папрацавалі» ў тралейбусах маршрутаў №№7 і 9. У прыватнасці, у аднаго з хлопцаў супрацоўнікі міліцыі знайшлі... 29 малаткоў для аварыйнага разбівання шкла ў маршрутных транспартных сродках, якія затрыманы скраў з салонаў тралейбусаў цягам дня.

Сяргей РАСОЛЬКА

Перадайце добраахвотна зброю

24-28 лютага Міністэрства ўнутраных спраў праводзіць аператыўна-прафілактычныя спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы «Арсенал» па добраахвотнай перадачы зброі і боепрыпасаў.

У краіне сёлета канфіскаваны 142 адзінкі незарэгістраванай зброі і звыш тысячы боепрыпасаў рознага калібру. 1,4 тысячы боепрыпасаў і 26 адзінак зброі грамадзяне здалі добраахвотна. Розныя віды зброі нярэдка выкарыстоўваюцца для незаконнага палявання. Для прадухілення фактаў браканьерства плануецца правядзенне сумесных рэйдаў з работнікамі падраздзялення Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншымі прыродаахоўнымі арганізацыямі. Праваахоўнікі праверацьтаксама і ўмовы захоўвання агнястрэльнай зброі ў законных уладальнікаў, канфіскуюць яе ў тых, хто мае супрацьпаказанні да валодання зброяй. З пачатку года ў індывідуальных уладальнікаў ужо канфіскавана 177 адзінак зброі — у асноўным за дробныя правапарушэнні, страляніну ў населеным пункце, распіванне спіртнога ў грамадскіх месцах або з'яўленне там у п'яным выглядзе.

Згодна з законам, за незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў прадугледжана пакаранне аж да пазбаўлення волі тэрмінам на 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Пры добраахвотнай здачы зброі ў органы ўнутраных спраў грамадзяне вызваляюцца ад адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці, нагадвае **старшы інспектар па дазвольнай рабоце аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска Юрый СІЛІВОНЧЫК.** У Першамайскі РУУС г. Мінска можна звярнуцца на адрас: вул. Бялінскага, 10 (тэл. 280 97 31, 280 02 02, 280 24 42). Паведамленні таксама прымаюцца па нумарах: 218 55 27, 218 73 56, 218 77 24, 218 75 82 або 102.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Простая мова

«ПАЧЫНАЕЦЦА ЎСЁ З ЛЮБОВІ...»

«Як ля парога, такая і дарога».

Ну паспрабуй не ўзгадаць гэту прыказку, калі з самага ранку і ля самага дома кот наперарэз — вялізазны, чорны. Хоць ты назад вярніся...

Але трэба ісці...

Дык чаму б тады на хаду не падумаць, што кот, вось такі, у некага дома жыве, «дарогу» пераходзіць не раз на дні... І нічога: ніякіх непрыемнасцяў — толькі радасць.

ДЗЕ Я?

Горад, дзень — народу ў аўтобусе мала. Да таго ж кіроўца, відаць, профі: плаўна пад'язджае да кожнага прыпынку, плаўна кранаецца з месца, ды і потым яго машына як быццам не едзе, а проста плыве па вуліцах. Не дзіва, што адзін з пасажыраў (відаць, напрацаваўшыся?..) спіць: спіць, выпрастаўшы ногі, прыхінуўшыся да акна, а ўжо ж соладка...

І, здавалася, моцна. Аднак не — на старым «ляжачым паліцэйскім» наш аўтобус крыху падкідае, пасажыр прачынаецца — спешна «падцягвае» ногі, няўцямна пазірае вакол, пытае ў чалавека, што сядзіць насупраць:

— Дзе я?

— Батанічны сад праязджаем, — ахвотна адказвае той.

— А горад які?

...Значыць, і сапраўды, «напрацаваўся» чалавек, прычым няслаба.

НЕЛЮБОЎ? ДА ХАЛАДОЎ

Крамы таварам забітыя — носа не ўткнуць, штось з адзежы проста не выцягнуць з кранштэйнаў, не разгледзець... Ну але ж...

За спадніцу вочы «зачапіліся» — доўгая, чорная, элегантная. У такой куды хочаш можна пайсці: зранку — на працу, вечарам — у госці альбо ў тэатр...

— Яна з жакетам, гэта касцюм, — абрывае думкі прадавачка. — І, дарэчы, акурат на вас.

Прыйшлося памераць.

Спадніца «села», як тут і была, а вось верх...

— Велікаваты як быццам?

— Ну што вы! Ды ў самы раз! — пераконвала дзяўчына і гэтак жа настойліва раіла: — Бярыце, не пашкадуеце.

Узяла (не без ваганняў, праўда), прынесла дамоў і спадніцу нават насіла.

А вось жакет... «Вазьмі, Даніла, што нам няміла» — хто яго толькі ні мераў! Марна: некаму з сябровак-суседак-сваячак не падыходзіў колер, некаму фасон, памер... У выніку новая добрая рэч з крамнаю біркаю ў шафе так бы і вісела... Каб не мароз.

А прыціснуў — і неяк нечакана высветлілася, што той жакет зусім не вялікі («мой памерчык», як казаў Папандопала). А ўжо ж цёплы, утульны, мілы...

Яшчэ і тым, што ніхто яго не ўзяў...

Гэта мы пра што? Пра адзежыну, рэч... Хоць з тым жа поспехам маглі і пра... чалавека.

СКАЗАЎШЫ «А»...

Памылкі, не вам казаць, бываюць. Бываюць граматычныя, сінтаксічныя, стылістычныя, гістарычныя, геаграфічныя... Бываюць, урэшце, грубыя і бываюць смешныя. У артыкуле пра тое, як засцерагацца ад холаду, як ратавацца, калі ўсё-ткі змерз, каляжанка раіць самае простае — рукі сагрэць «пад... мышкамі».

І пры гэтым не піша, на жаль, дзе ж іх браць? Як дамовіцца з катом, каб налавіў?.. Ці трэба самому?

«РЭПЕТЫЦЫЯ»

...Яна ў сорак (з хвосцікам) выглядала, можа, на трыццаць, ён — наадварот.

Але гэта яны заўважылі потым. А тады...

Сонейка, мора, пляж — доўгачаканы водпуск. І падчас яго так дарэчы маленькі курортны раман...

Вось толькі з «памерамі» яны «прамахнуліся»: думалі, што раз'едуцца па дамах, па сваіх гарадах, і ўсё скончыцца, а выйшла інакш: ледзь не кожны дзень звалілі адно аднаму; ён за моду ўзяў прыязджаць — на выхадныя, на святы... Альбо яе да сябе выцягваць... І ў адпачынак ездзілі: ну чаму б і не, калі разам добра і калі абое яны — людзі вольныя (у разводзе). А так — «як бы» шлюб у іх, гасцявы...

Ды і сапраўдны мог атрымацца! Ён прапаноўваў. Гэта яна адмаўлялася, гэта яна баялася і «хавалася» то за дзяцей, яшчэ неўладкаваных, то за матулю, як быццам старую і вельмі хворую... Галоўнай жа прычынай быў злашчасны ўзрост: яму на адзінаццаць гадоў менш. Значыць, не сёння-заўтра ў яго, пры ўсім, далёка не беднага (толькі вокам міргні!) магла з'явіцца іншая, куды маладзейшая, прыгажэйшая, разумнейшая... Ёй не хацелася быць пакінутай (да таго ж — яшчэ раз)...

А ён, падобна, не збіраўся яе кідаць: не так даўно вось чарговую прапанову зрабіў, больш за тое — змусіў яе не проста падумаць, а пераехаць да яго і жыць.

Яна згадзілася — на «рэпетыцыю». Амаль месяц пражыла. Болей, прызналася, проста не змагла.

Не змагла многага. Ну, па-першае («хоць салому ем ды фасону ж не губляю»!), днямі хадзіць на абцасах і без акуляраў; мераць ціск крадком, піць таблеткі гэтак жа, прачынацца нашмат раней, каб не ўбачыў без прычоскі ды макіяжу, спаць у непрывычнай піжаме...

— А дома — ну як ажыла, — расказвала сяброўкам са смехам. — Прыехала, у ванну залезла, выкупалася, потым халат на плечы, ручнік на галаву — і на канапу... Ну які ўжо замуж? Дзе мне лепей будзе?

...Бацькі, значыць, праўду казалі: «Еш з голаду, любі — змоладу»?

Ды не ўсім на гэта пашчасціць.

ЖЫЦЦЁ, ЯК АНЕКДОТ

Штодзённічына: раніца, рэдакцыя, тэлефонны званок. Голас у слухаўцы мужчынскі, зусім незнаёмы, але малады і досыць прыемны — прамаўляе (па-беларуску), што адправіў артыкул, што хацеў бы ведаць, ці атрымалі, ці будзем друкаваць...

У тым выпадку адказаць зусім няцяжка было: праз гадзіну-другую набрала патрэбны нумар, для парадку ўдакладніла:

— Спадар Мацвей?

Рэакцыя досыць нечаканая:

— Хто-о-о?! — пакрыўджана (ды што там — абурана!) перапытаў той...

І тым самым нагадаў кароткі, як стрэл, анекдот з жыцця пасажыраў:

— Спадарыня, ну што вы сталі, як карова!

— Якая я вам спадарыня?!

МАЛЫ ДЫ ЎДАЛЫ

Шыкоўная кніжка (наклад, дарэчы, 300 асобнікаў) — «Слоўнік беларускіх народных параўнанняў»! Чаго ў ім толькі няма, чаго не сабрана працай рупліўцаў! Ну вось пра сабаку, напрыклад. Уяўляйце, запамінайце (раптам спатрэбіцца?), успамінайце: *з'ехаць, як сабака з сена; пажывіцца, як сабака мухаю; разгуляцца, як ён жа ў торбе; гонару, як у сабакі блох*, хоць часцей за ўсё *трэба ён, як сабаку гальштук, паабяцаць, што сабаку хвастом махнуць*... (Ёсць, ёсць вось такія людзі!.. А колькі гэтакіх (з кніжкі ж таксама слова не выкінеш? — **Аўт.**): *адзін брэша, як сабака, а другі маўчыць, як ср...ка*...

Магчыма таму, што *«дурны, як сабака да года»?..*

Пад уражаннем і разумны сабака ўзгадаўся.

З ім, маленькім, — расказвалі — адна пані, вярнуўшыся з Вільні, у парк пайшла. А там скуль ні вазьміся дзіця — насустрач выбегла. Сабачка неспадзеўкі — яму пад ногі. Малое ад страху ў крык... Добра — пані не разгубілася, і не ліхадзейкай была: падхапіла малое на рукі, загадала папляваць, завяла ў свой пакой, пачаставала і дала 5 злотых: па тым часе вялікія грошы — за іх 2 мяшкі жыта можна было купіць.

Мусіць, таму кемлівая малеча, дачушка парабкаў, шмат разоў яшчэ бегала ў парк: хочучы зарабіць, выскаквала насустрач пані з сабачкам. Аднак той дзіця больш не чапаў. Відаць, «не да года» быў. Хоць і маленькі.

НЕ ПРА ДАХ

Гэтыя аднакласнікі, як многія, відаць, абяцалі сустракацца ў школе штогод, а вось прыязджалі...

Ці вам казаць — праз год пасля выпуску, потым — праз пяць, праз 20 і сёлета — праз сорак. Аж пятнаццаць чалавек з двух класаў сабралася — пераважна «дзяўчат». Праўда, «хлопцы» таксама былі. І нават зрабілі ўсё па-дарасламу, па-мужчынску: прывезлі на сустрэчу любімых настаўнікаў, загадзя заказалі «нішу» ў рэстаране...

Добранька пасядзелі: пагаварылі, паўспаміналі, папілі-папелі, патанцавалі, а «дзяўчаткі» дык нават папляткарыць паспелі і пасакрэтнічаць.

Адна з іх расказала, прынамсі, як закахалася («дах падчыстую знесла!»), як кінула дом, дзяцей (!), як паехала на край свету... Як жыла там, што называецца, «на разрыве» паміж сапраўдным і пакінутым, як яно, тое апошняе, стала ўсё больш перацягваць і як тады першы муж ёй сказаў: «Кінь дурное і вяртайся. Слова даю, што ніколі ні ў чым не папракну»...

«Санта-Барбара», карацей.

«Дзеўкі» слухалі яе, стаіўшы дыханне, а адна — самая чуллівая — дык і наогул слязу пусціла.

— Не трэба мяне шкадаваць, — спыніла яе апавядальніца.

— А я не цябе, не! — шморгнула носам аднакласніца. — Я... сябе шкадую: ані разу ў жыцці мне «дах не зносіла»...

І ўжо не знясе.

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ

Вечар. Горад. Метро.

— Станцыя «Няміга», — аб'яўляюць па гучнай сувязі.

Аб'яўляюць немаведама каму, бо вагон амаль пусты: пяць чалавек выйшла, адзін зайшоў: высокі-высокі, худы-худы, у даўжэзным, да пят, чорным паліто з капюшонам, што закрываў паўтвара...

Для поўнай жуды толькі касы ў руках не хапала.

ДРЭННА — І ТАК, І ГЭТАК

...«Ну, ці добры ў вас дзень? — сумяшчаючы вітанне з пытаннем, цікаўлюся ў знаёмага дзеда.

Адказвае ён па-рознаму: то ўлюбёным: «Паскудства, брат, і не пытайся», то (з-за бяссонніцы — гадзін у 11...): «Не ведаю — ён жа толькі пачаўся...», то, апошнім часам: «Не хочацца ні жыць, ні паміраць»...

Што зразумець няцяжка. Асабліва калі ведаць, што ён, насамрэч стары і хворы — зусім адзін... Калі не лічыць сястры, праўда, зводнай, гадоў на 20 за яго маладзейшай і, па сутнасці, зусім чужой...

Аднак менавіта яна — спадкаемца: на кватэру, на якія-ніякія грошы...

І каб адна — дзед бы не гараваў: «Халера з ім, з дабром за жыццё набытым»... А то ж трое сыноў у кабеты — боўдзілаватых, дарослых, а ўжо ж сквапных... Спяць і бачаць яны, як стары памрэ, як яны тады...

Пазабіваюцца ж, перагрызуцца...

У ЧЫМ ВЫМЯРАЕЦЦА ШЧАСЦЕ

Горад, кавярня, шматлюдны абед і над усім — гучнае пытанне:

— Э-э, хто на ўваходзе свой чорны «Мерседэс» паставіў?!

Замест адказу і з-за таго ж століка:

— Слухай, чаго ты равеш? Гэта ж твая машына!

— А можа, хто не ў курсе?!

Гэта анекдот пра Наташу, бо яна, здаецца, і сапраўды ўсяму свету ўжо рассказала, што дзве машыны дабіла, а цяпер ёй бацька трэцюю купіў — новенькую, з салона...

— Добра табе...

— Шчаслівая...

— Багатая, — за вочы і ў вочы зайздросцяць ёй сяброўкі, бо...

Бо яно і сапраўды ў іх, 20-гадовых, шчасце ды багацце можа вымярацца «ў машынах». А вось потым, напрыканцы...

Хіба ў колькасці людзей (пажадана побач!), якіх любіш ты і якія любяць цябе.

Яны — ці не адзінае дабро, што нажываем мы не за грошы, не мазалём ці хітрасцю — працаю душы.

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж і, магчыма, новым падпісчыкам: кніга, складзеная з такіх вось абразкоў-карацелек «Каб сказаць і... пачулі», у кнігарнях Мінска, прынамсі, яшчэ прадаецца. Пытайцеся.

